# БЯСПАЛАЯ
# Марыя Аркадзьеўна

Нарадзілася 25 лістапада 1948 года. Месца нараджэння — невялічкая вёска Выжлавічы на захадзе Піншчыны, здавалася, не магла стаць той перадумовай, якая адкрыла шлях у навуку. Аднак уплыў розных абставін, і перш за ўсё сям'і, прадвызначылі цікавасць да гісторыі.

Ва ўспамінах блізкіх людзей адлюстраваліся галоўныя падзеі XX стагоддзя — першая сусветная вайна, трагедыя бежанцаў, рэвалюцыйныя змены, трохразавая эміграцыя ў ЗША, вяртанне на радзіму, падзеі 1939 года, другая сусветная вайна і звязаныя з ёю эпізоды партызанскай барацьбы і прымусовых работ у Германіі, падзеі 40-х гадоў у заходнебеларускай вёсцы. Сістэматызацыя гэтых ведаў адбылася пад уплывам настаўніка гісторыі і дырэктара Бярозавіцкай сярэдняй школы Л.А. Дзянішкевіча. Пасля яе заканчэння ў 1966 годзе быў гістарычны факультэт БДУ, дзе разуменне гісторыі паглыблялася пад уплывам вядомых вучоных. Пасля заканчэння універсітэта і да 1979 года — праца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Далейшае станаўленне як выкладчыка і навукоўца адбывалася на кафедры гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры. Вынікам сталі публікацыя навуковых работ і абарона ў 1999 годзе доктарскай дысертацыі па гісторыі беларускай вёскі ў гады НЭПа.

84(4Бел)
Н 124







# На ладонях Припяти и Пины

